# Віды словазлучэння ў

# Што гэта?

- **Словазлучэнне** – гэта такое сэнсава-граматычнае аб’яднанне двух або некалькіх самастойных слоў у сказе, якія звязаны паміж сабою граматычна і па сэнсу і абазначаюць пэўныя паняцці (***шмат кругоў***).

**Словазлучэнні**

↓

↓

**простыя**

**складаныя**

Простыя словазлучэнні ўключаюць у свой склад два самастойныя словы (*блакітнае неба*). Да простых словазлучэнняў адносяць словазлучэнні

1) у якіх залежны кампанент выражаны складанай назвай (*наведаць Далёкі усход*);

2) якія выражаны сінтаксічна непадзельным спалучэннем (*спаць трывожным сном – неспакойна*). У такіх словазлучэннях залежная частка выконвае функцыю аднаго члена сказа.

“

- **Складаныя словазлучэнні** – гэта тыя, што складаюцца з трох і больш самастойных слоў. Яны ўтвараюцца:
- 1) шляхам далучэння да залежнага слова аднаго або некалькіх паясняльных слоў (**успамінаць наша свята**);
- 2) шляхам далучэння да галоўнага слова аднаго або некалькіх паясняльных слоў (**з задавальненнем успамінаць свята**);
- 3) шляхам далучэння да галоўнага і залежнага

## Класіфікацыя паводле сэнсавай спаянасці кампанентаў:

**Словазлучэнні**

↓ ↓

**свабодныя** **несвабодныя**

- У свабодных словазлучэннях словы захоўваюць сваю сэнсавую самастойнасць і могуць свабодна ўступаць у сінтаксічныя адносіны з іншымі словамі. Свабодныя словазлучэнні абазначаюць расчлянёныя паняцці. Кожнае слова, што ўваходзіць у такія словазлучэнні, мае свае асобныя функцыі ў сказе.

- Несвабодныя словазлучэнні страцілі сэнсавыя і граматычныя адносіны паміж словамі і ўжываюцца для абазначэння аднаго нерасчлянёнага паняцця. Пэўнае слова такіх словазлучэнняў, як правіла, мае пераносны сэнс, а таму не можа ўступаць свабодна ў спалучэнні з іншымі словамі (палярны круг, набіць руку). У сказе такія словазлучэнні выконваюць ролю аднаго члена сказа.

# Важна!

Неабходна размяжоўваць сінтаксічна несвабодныя (**дзяўчынка з блакітнымі вачамі, чалавек сталага ўзросту**) і фразеалагічна несвабодныя словазлучэнні (**своечасова даць лататы**).

Класіфікацыя паводле сінтаксічнай сувязі:

**Словазлучэнні**

↓ ↓

**прэдыкатыўныя** **непрэдыкатыўныя**

- Прэдыкатыўныя словазлучэнні – спалучэнне дзейніка і выказніка.
- Непрэдыкатыўныя словазлучэнні звязваюцца пры дапамозе гіпатаксічнай і паратаксічнай сувязі. Гіпатаксічная сувязь – гэта аб’яднанне двух граматычна нераўнапраўных слоў, з якіх адно залежыць ад другога. Злучальная сувязь характэрна для граматычна раўнапраўных слоў.

Класіфікацыя паводле выражэння галоўнага слова

**Словазлучэнні**

↓ ↓ ↓

**іменныя дзеяслоўныя прыслоўныя**

**−назоўнікавыя,**
**−прыметнікавыя,**
**−лічэбнікавыя,**
**−займеннікавыя.**



Дапамога калгасу – назоўнікавае, здольны да вучобы – прыметнікавае,

трэці ад краю – лічэбнікавае, што-небудзь прыемнае – займеннікавае,

ісці лесам – дзеяслоўнае, разам з сябрамі – прыслоўнае.

***Піць каву (дзеяслоўнае)***

## *Прыгожыя птушкі (прыметнікавае)*



# Назіранне за светам (назоўнікавае).

